Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/11/2026 01:16:29

Сяргей Кавалёў
Люблін

Мастацкая інтэрпрэтацыя вобраза Кастуся Каліноўскага ў беларускай драматургіі XX–XXI стст.

Artistic interpretation of the image of Kastuś Kalinoŭski in Belarusian Drama of the 20th–21st centuries

З нагоды 150-х угодкаў паўстання 1863 г.

Постаць Кастуся Каліноўскага з'яўляецца знакавай для беларускай культуры: вобраз легендарнага паўстанца сустракаецца ў шматлікіх літаратурных творах, упрыгожвае мастацкія палотны, перыядычна ўзнікае на тэатральных падмостках. Аналізуючы мастацкую эвалюцыю вобраза Кастуся Каліноўскага на беларускай сцэне можна, па-сутнасці, прасачыць гісторыю нацыянальнага тэатра.

Пачатак тэатральнаму ўвасабленню постаці Каліноўскага паклаў драматург і рэжысёр Еўсцігней Міровіч, напісаўшы і ўвасобіўшы на сцэне Першага Беларускага дзяржаўнага тэатра (БДТ–1) гістарычную драму *Кастусь Каліноўскі*. Адбылося гэта ў 1923 г., на хвалі адраджэнскага руху і палітыкі беларусізацыі ў рэспубліцы. Еўсцігней Міровіч, які з'яўляўся ў той час кіраўніком БДТ–1, сутыкнуўся з праблемай катастрафічнага недахопу ў рэпертуары тэатра нацыянальнай драматургіі і мусіў сам узяцца за пяро, ствараючы на працягу некалькіх гадоў шэраг цікавых гістарычных і легендарна-гістарычных драм: *Машэка*, *Кастусь Каліноўскі*, *Каваль-ваявода*. Напісанню п'есы *Кастусь Каліноўскі* папярэднічала вялікая падрыхтоўчая праца, знаёмства аўтара з дакументальным і навуковым матэрыялам пра паўстанне 1863 г.

Як адзначае аўтар манаграфіі *Teatr białoruski 1920–1930. Odrodzenie i zagłada* (Варшава, 2013) Андрэй Масквін: "Міровіч не меў ані намеру, ані магчымасці паказаць усю гісторыю паўстання. Ён хацеў перад усім засяродзіцца на постаці Каліноўскага і прадставіць яго як чалавека выключнага і незвычайнага, гатовага ахвяраваць жыццём у імя свабоды іншых".[1]

[1] A. Moskwin, *Teatr białoruski 1920–1930. Odrodzenie i zagłada*, Warszawa 2013. Przekład Siarhiej Kawalou.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/11/2026 01:16:29

Каліноўскі ў трактоўцы Еўсцігнея Міровіча паўставаў як адважны рэвалюцыянер, змагар за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне сялян, палымяны патрыёт. "Народ" – слова, якое найчасцей паўтараецца ў п'есе Міровіча. Празмерна пафасны вобраз Каліноўскага ажыўляў і разнастаіў сваёй выдатнай ігрой акцёр Уладзімір Крыловіч, якому менавіта гэтая роля прынесла найбольшую славу. Спектакль *Кастусь Каліноўскі* стаўся значнай грамадскай падзеяй, выклікаў прыхільнасць гледачоў і крытыкаў, захопленыя водгукі Змітрака Бядулі, Янкі Купалы і іншых беларускіх пісьменнікаў.

Што праўда, з пазіцый сённяшняга дня п'еса Е. Міровіча выклікае і пэўныя заўвагі. Вядома, для тагачасных гледачоў, выхаваных на бальшавіцкіх ідэях бескампраміснай класавай барацьбы, прайшоўшых цяжкія выпрабаванні на франтах Грамадзянскай вайны было, відаць, нармальным, што беларускія сяляне на чале з пераапранутым у праваслаўнага дзяка Каліноўскім спачатку радушна прымаюць на пастой атрад рускіх жаўнераў, частуюць іх, разам п'юць, гуляюць, спяваюць і таньчаць, а ноччу бязлітасна выразаюць увесь атрад. Але ў сучаснага чалавека такая крывадушнасць і жорсткасць выклікае пэўны маральны дыскамфорт. Напэўна, як і паводзіны Каліноўскага ў кабінеце графа Мураўёва: застаўшыся на хвіліну без нагляду палымяны рэвалюцыянер (гэтым разам пераапрануты ў форму казацкага афіцэра) крадзе ў гаспадара вялікую суму грошаў (вядома, на патрэбы паўстання, гэтакі рэвалюцыйны "экс" у стылі расійскіх народнікаў і эсэраў-максімалістаў).

Нягледзячы на пэўныя недахопы, п'есу *Кастусь Каліноўскі* трэба прызнаць несумненнай творчай удачай Еўсцігнея Міровіча, як і пазнейшы спектакль. Асоба Кастуся Каліноўскага давала выдатныя магчымасці аб'яднаць рэвалюцыйную ідэю з нацыянальнай, што і зрабіў Міровіч, няхай сабе з акцэнтам на рэвалюцыйнасці героя ў духу свайго часу. Невыпадкова п'еса была пастаўлена пазней – у 1929 г. – яшчэ і ў тэатры Уладзіслава Галубка, рэжысёрам спектакля выступіў тым разам Фларыян Ждановіч.

У трыццатыя гады патрыятычны вобраз Каліноўскага аказаўся небяспечны для камуністычнай улады і наступны раз на тэатральнай сцэне публіка ўбачыла паўстанца толькі ў 1947 г. у оперы Дзмітрыя Лукаса *Кастусь Каліноўскі* паводле лібрэта Міхася Клімковіча. У відовішчным і пафасным спектаклі адлюстравалася прыўзнятая атмасфера ў савецкім грамадстве пасля перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, каб уславіць вызваленчую барацьбу беларускага народа і ў той жа час абысці небяспечныя антырасійскія акцэнты ў дзейнасці галоўнага героя стваральнікі оперы свядома акцэнтавлі ўвагу на яго антыпольскіх настроях.

Адным з самых удалых тэатральных увасабленняў вобраза Каліноўскага ў другой палове XX ст. лічыцца спектакль Валерыя Мазынскага *Кастусь Каліноўскі* ў Беларускім акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа паводле аднайменнай п'есы Уладзіміра Караткевіча.

П'еса Караткевіча *Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць* была напісаная ў 1963 г. да 100-годдзя паўстання 1863 г. Напэўна, аўтар перад тым, як узяцца за

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/11/2026 01:16:29

напісанне трагедыі пра Кастуся Каліноўскага, перачытаў п'есу Еўсцігнея Міровіча. Але творчым арыенцірам для У. Караткевіча стаўся іншы твор: *Барыс Гадуноў* Аляксандра Пушкіна. Менавіта *Барыс Гадуноў* быў для Караткевіча ўзорам гістарычнай драмы ("Я напісаў табе *Барыса Гадунова*. Бяры і стаў", – казаў пісьменнік рэжысёру Валерыю Мазынскаму, калі той прасіў аўтара ўнесці некаторыя змены ў п'есу). Арыентацыя на пушкінскую трагедыю адчуваецца ў маштабнасці твора, перанасычанасці п'есы персанажамі (больш за трыццаць дзеючых асобаў), і, самае галоўнае, у прысутнасці побач з вобразам галоўнага героя вобразаў прадстаўнікоў народа (Чортаў Бацька, Яўхім і Яўхіміха, Чорная плакальшчыца, юродзівы Агей, нямы Ян і інш.) .

У адрозненні ад Еўсцігнея Міровіча Уладзімір Караткевіч большую ўвагу акцэнтуе на нацыянальных, а не на рэвалюцыйных перакананнях Кастуся Каліноўскага, на яго патрыятызме, самаахвярнай любові да Беларусі. Але калі паставіць пытанне, кім з'яўляецца Каліноўскі ў п'есе Караткевіча ў першую чаргу: рэвалюцыянерам ці патрыётам, адказ будзе нечаканым: паэтам. Паэтам, які займаецца небяспечнай рэвалюцыйнай дзейнасцю, ахвяруе жыццём дзеля вызвалення роднага краю і беларускага народа ад расійскага прыгнёту, але ў душы застаецца творцам – рамантычным, летуценным, закаханым. Напрыклад, у адной са сцэнаў Уладзімір Караткевіч укладае ў вусны "чырвонага дыктатара Літвы", "Яські, гаспадара з-пад Вільні" наступныя лірычна-філасофскія радкі:

Пусціце зоры ў мой пакой шырокі!
Пусці ў пакой сузор'і, чалавек!
Нічога не палохайся. Пад сонцам
Ёсць толькі ты і светлыя сузор'і.
Нічога, акрамя цябе і іх.
Каханне, зорка чыстая, ў глыбінях
Бязмежнага сусвету ты гарыш
Святлом далёкім, цёплым, нездрадлівым,
О колькі год я да цябе ляцеў,
Раскрыліўшы свае слабыя рукі,
І сек сваім мячом мячы камет!
Я знемагаў, я паміраў у муках
І ты пачула мой апошні крык.
Сама прыйшла, наблізілася, ўпала
Ў маю далонь. І стала ўсім на свеце.
Ўсё – ты. Маё чаканне – гэта ты,
Маё змаганне, і душа, і вочы,
Любоў, нянавісць, вера і сумненне –
Ўсё гэта ты. І праўда, і дыханне,
І… нават смерць. Нічога не баюся.
Бо космас неўміручы ў гэтым сэрцы,
Бо космас не заб'еш. І я лячу,
Лячу ў сусвет.[2]

[2] У. Караткевіч, *Збор твораў,* у 8 т., Мінск 1990, т. 8, кн. 1, с. 80.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/11/2026 01:16:29

Караткевічаўская ідэалізацыя, паэтызацыя галоўнага героя гарманічна ўпісвалася ў метафарычна-сімвалічны стыль рэжысёра Мазынскага. Пастаўлены ў 1978 г. – праз пятнаццаць гадоў пасля напісання п'есы – спектакль Мазынскага стаў найбольш арыгінальным увасабленнем вобраза Каліноўскага ў беларускім тэатры другой паловы XX ст.

Вялікія магчымасці для адметнага тэатральнага ўвасаблення давала драматычная паэма Аркадзя Куляшова *Хамуціус* (1975), у якой намаляваны глыбокі псіхалагічны партрэт героя. Вядома, у паэме Куляшова, напісанай у савецкія часы, таксама завостраны канфлікт паміж панамі і мужыкамі, аўтар старанна затушоўвае антырасійскія і антыправаслаўныя матывы ў праграме і дзейнасці Каліноўскага і ўсяляк выпукляе яго грамадска-сацыяльныя ідэі:

> Мужык і пан. Пан і мужык. Не ў слове
> Хаваецца іх сутнасць, а ў аснове,
> З якой яны, як з плесені грыбы,
> Растуць. "Дзе ўладары, там і рабы".[3]

Такую трактоўку паўстання 1863 г. ахвотна падхапілі даследчыкі творчасці Аркадзя Куляшова. Напрыклад, Міхась Арочка ў *Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя* адзначаў: "У аўтара *Хамуціуса* раскрыўся выключны дар ужывання ў навальнічную атмасферу паўстанчых бітваў Каліноўскага. Сваім драматычным чуццём паэт разгадаў галоўны канфлікт часу. З першых радкоў твора загучала вядучая танальнасць, той лейтматыў, у якім вузлавая праблема гісторыі – зямля. У ёй, гэтай праблеме, канцэнтравалася сувязь многіх часоў, рэвалюцыйных выбухаў, трагічных зыходаў".[4]

Насамрэч сваім творам А. Куляшоў імкнуўся не толькі перадаць сутнасць падзей, разгадаць канфлікт часу, але і ўвасобіць духоўныя пошукі, асаблівасці характару герояў. На жаль, стваральнікі аднайменнага спектакля *Хамуціус* у Брэсцкім абласным тэатры (1981) пайшлі традыцыйным шляхам рамантызацыі постаці Каліноўскага, пракладзеным рэжысёрамі Міровічам і Мазынскім.

Апошнім па часе стварэння драматургічным творам пра Кастуся Каліноўскага з'яўляецца п'еса Алеся Петрашкевіча *Рыцар свабоды*. П'еса была напісана ў 2003 г. з нагоды 140-х угодкаў паўстання 1863 г., друкавалася ў газеце "Новы час" (урыўкі, ліпень-жнівень 2003 г.) і ў часопісе "Дзеяслоў" (2004, №8), але пакуль не была ўвасоблена на тэатральнай сцэне. Прычына незапатрабаванасці сучасным беларускім тэатрам п'есы А. Петрашкевіча тоіцца як у ідэйна-мастацкіх асаблівасцях п'есы, так і ў сённяшнім стане нацыянальнага тэатра, а шырэй – усяго беларускага грамадства.[5]

---

[3] А. Куляшоў, *Збор твораў,* у 5 т, т. 5, с. 125–126.

[4] М. Арочка, *Аркадзь Куляшоў* [у:] *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя,* у 4 т, т. 3, Мінск 2002, с. 453.

[5] Сімптаматычна, што задумаўшы ў 2011 г. вывесці постаць Кастуся Каліноўскага на сцэну Рэспубліканскага тэатра юнага гледача (спектакль *Майго юнацтва крылы…*), рэжысёр

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/11/2026 01:16:29

У адрозненні ад многіх айчынных і замежных гісторыкаў, Алесь Петрашкевіч ні на хвіліну не сумняваецца ў беларускай самасвядомасці Кастуся Каліноўскага. Ягоны герой адмаўляецца на допытах у царскім засценку адказваць на расейскай альбо польскай мове і з гонарам заяўляе расійскаму следчаму Шалгунову: "Я буду размаўляць толькі на мове сваіх бацькоў, дзядоў і прадзедаў і маўчаць на ўсіх іншых, у тым ліку і на вашай расейскай".[6] Не сумняваецца ў беларускасці Каліноўскага і следчы Шалгуноў, які з баязлівай павагай сцвярджае: "Грамоты Стеньки и Емельки ни в какое сравнение не идут с инструкциями, приказами, манифестами и политической публицистикой с теоретическими разработками освободительной войны, принадлежащими Калиновскому. Он – мыслитель, публицист божьей милостью, первый настоящий национальный белорусский политический деятель!…"[7]

Алесь Петрашкевіч выкарыстаў у п'есе багатыя дакументальныя матэрыялы пра жыццё і дзейнасць Каліноўскага, даступныя напачатку XXI ст., шчодра цытаваў гістарычныя і літаратурныя крыніцы: артыкулы з «Мужыцкай праўды», інструкцыі і загады Літоўскага Правінцыйнага Камітэту, успаміны К. Кашыца, Я. Гейштара і інш. Чалавеку, які цікавіцца гісторыяй паўстання 1863–1864 гг. і гісторыяй Беларусі ўвогуле, вельмі карысна будзе прачытаць п'есу *Рыцар свабоды*, як і іншыя гістарычныя драмы Петрашкевіча[8], галоўнай тэмай якіх з'яўляецца "ідэя незалежнасці Беларусі".[9]

З іншага боку, перагружанасць фактамі, моўная і стылістычная стракатасць, выразная публіцыстычная скіраванасць твора не пайшлі на карысць яго мастацкай прыродзе. У п'есе *Рыцар свабоды* няма дынамічнага дзеяння і амаль адсутнічае сюжэт. Характары герояў, іх светапогляд раскрываюцца праз бясконцыя маналогі і дыялогі. Каліноўскі ў інтэрпрэтацыі А. Петрашкевіча – не дзейсны правадыр паўстанцаў, а найперш палітолаг і тэарэтык рэвалюцыйнага дэмакратызму. Многія выказванні рэвалюцыянера гучаць не вельмі натуральна і дарэчна, калі ўлічыць, што іх прамаўляе дзеяч XIX стагоддзя, а не XXI. Так, развагі Каліноўскага пра праявы нацыянальнага жыцця, літаратурны працэс, генацыд і г.д. наўрад ці маглі быць сфармуляваныя ў 1864 годзе. Некаторыя фразы героя, выказаныя ў прыватнай размове нагадваюць газетныя перадавіцы ці падручнікі па паліталогіі. Напрыклад, у размове з расійскім палкоўнікам Лосевым герой заяўляе: "Белая Русь, Літва, Польшча, Каўказ і народы ўсходніх і сярэднеазіяцкіх калоніяў

Уладзімір Савіцкі звярнуўся не да нацыянальна-адраджэнскай па духу, але дэкларатыўнай па манеры п'есы Петрашкевіча, а да напісанай у савецкі час драматызаванай паэмы Аркадзя Куляшова.

6 А. Петрашкевіч, *Рыцар свабоды: Трагедыя ў дзвюх дзеях*, "Дзеяслоў", 2004, №8, с. 136.

7 *Ibid.,* с. 148.

8 А. Петрашкевіч (1930–2012) з'яўляецца аўтарам звыш дваццаці п'ес, у тым ліку гістарычных драм *Напісанае застаецца*, *Русь Кіеўская*, *Прарок для Айчыны*, *Воля на крыжы*, *Меч Рагвалода* і інш.

9 B. Siwek, *Wolność ukrzyżowana. Rzecz o białoruskim dramacie i teatrze*, Lublin 2011, с. 124.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/11/2026 01:16:29

расійскай імперыі ня тое што доўга, а ніколі ў вякі вякоў не забудуць вашых крывавых подзвігаў на іх землях».[10] На парозе смерці арыштант-Каліноўскі як прафесійны гісторык аналізуе прычыны паразы паўстання 1863–1864 гг.: "І мы, і Польшча памыліліся ў рускім народзе. І ня толькі ў тым, што ён не падтрымаў нашай рэвалюцыі і сам у яе не ўключыўся. Пасля многагадовай вынішчальнай вайны на Каўказе расіяне перанесьлі шавіністычную нянавісьць усіх сваіх слаёў грамадства з народаў непакорнага Каўказа на народы Польшчы, Беларусі і Літвы. Гэта была першая прычына нашай паразы. А другая, што вынікала з першай, гэта выкарыстанне расейскай арміяй набытага вопыту генацыду супраць каўказскіх народаў і прыменена да нашых паўстаўшых народаў. Трэцюю ракавую прычыну паразы спарадзіў Варшаўскі Цэнтральны нацыянальны камітэт, які адкінуў лозунг Герцэна "земля крестьянам – самобытность окраинам", зацьвердзіў праграму аднаўлення польскай дзяржавы ў межах былой Рэчы Паспалітай на 1772 год з уключэннем у яе склад Літвы, Беларусі і Правабярэжнай Украіны".[11]

Думаецца, п'еса Алеся Петрашкевіча *Рыцар свабоды* адносіцца да разнавіднасці "п'ес для чытання", а не да жанру п'ес для тэатральнага ўвасаблення. "Асучасненасць", навуковасць мовы героя можа сведчыць пра імкненне драматурга данесці найбольш поўную, сканцэнтраваную інфармацыю пра палітычныя погляды і рэвалюцыйную тэорыю Каліноўскага. У выніку, у пагоні за энцыклапедычнасцю аўтар аказаўся на шляху страты адпаведнасці паміж мовай і эпохай, думкамі і часам.

Зрэшты, наша ацэнка п'есы старэйшага калегі, які шмат зрабіў для папулярызацыі беларускай гісторыі драматургічнымі сродкамі і для сцвярджэння ідэалаў незалежнасці Беларусі, можа быць суб'ектыўнай. Значна вышэй ацэньвае мастацкія вартасці п'есы Петрашкевіча Беата Сівэк, аўтар манаграфіі *Wolność ukrzyżowana. Rzecz o białoruskim dramacie i teatrze* (Люблін, 2011). Польская даследчыца лічыць, што ў п'есе *Рыцар свабоды* Алесь Петрашкевіч паказаў усім вядомыя падзеі з іншага, новага пункту гледжання. На думку Беаты Сівэк: "Трагізм лёсу Каліноўскага атаясамліваецца, па-сутнасці, з трагізмам беларускай гісторыі. Матыў змяняючыхся гістарычных падзей пераплятаецца ў п'есе Петрашкевіча з драмай індывідума, які нават калі б хацеў пазбегнуць свайго прызначэння, ведае, што ад выроку лёсу ўцёкаў няма. У гэтым сэнсе постаць Каліноўскага рэалізуе мадэль наследавання Хрысту (*imitatio Christi*), які праяўляецца праз параўнанне з ахвярай Хрыста і яго збавіцельскай смерцю. […] Ахвяры Каліноўскага, як і ахвярам многіх іншых нацыянальных герояў, якім прысвяціў свае п'есы Петрашкевіч, пісьменнік надае эсхаталагічны сэнс. Каліноўскі ў аналізаванай п'есе з'яўляецца трагічнай постаццю, бо ўсе найлепшыя вартасці героя непазбежна вядуць яго да смерці. […] У спосабе стварэння вобраза Каліноўскага мы заўважаем выразную тэндэнцыю да ідэалізацыі. Аўтар выбірае такія факты

[10] А. Петрашкевіч, *op. cit.,* с. 135.
[11] *Ibid.,* с. 150–151.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 20/11/2026 01:16:29

з жыцця героя, паказвае нам яго з такой перспектывы, што ў пэўны момант постаць пачынае эвалюцыяніраваць у бок легенды ці міфа. Можна шмат распавядаць пра яго жыццё, палітычную дзейнасць або светапогляд, але выразна відаць, што такога роду інфармацыя адыходзіць на задні план. Кастусь Каліноўскі ператвараецца ў інструмент лёсу, постаць у арэоле шматзначных сэнсаў. Мы маем дачыненне з вобразам, які ў нашым успрыманні робіцца элементам міфа".[12]

Тэндэнцыі да ідэалізацыі і міфалагізацыі вобраза Кастуся Каліноўскага заўважаюцца, аднак, не толькі ў п'есе Алеся Петрашкевіча, а ва ўсіх, згаданых у гэтым артыкуле п'есах: Еўсцігнея Міровіча, Міхася Клімковіча, Уладзіміра Караткевіча, Аркадзя Куляшова. Сама Беата Сівэк, разглядаючы жанр гістарычнай драмы ў беларускай драматургіі, прыходзіць да слушнай высновы: "Шматлікія творы беларускіх пісьменнікаў пра мінулае Беларусі сведчаць пра тое, што гісторыя беларускага народа прадстае ў напластаванні міфаў, міф накладваецца ў іх на гісторыю, а містычныя падзеі на гістарычныя".[13]

А як некалі заўважыў Ода Марквард: "Барацьба з міфамі – справа безнадзейная"…

Summary

The person of Kastuś Kalinoŭski is of major importance for Belarusian culture: the image of the legendary insurgent is found in many literary works, adorns artists' canvases, and periodically appears on the stage of Belarusian theatres.

On the wave of the renaissance movement and policy of Belarusification in the 1920s the dramatist and producer Jeuścihniey Mirovič wrote and brought to the stage of BDT-1 a historical drama *Kastuś Kalinoŭski* (1923). In the 1930s the image of Kalinoŭski became dangerous for the Communist government, and the next time the public were able to see the rebel on stage was only in 1947 in an opera by Dźmitry Lukas, *Kastuś Kalinoŭski*, with a libretto by Michaś Klimkovič.

A vivid example of romantic drama was the production by Valery Mazynski at the Jakub Kolas Belarusian Academic Theatre, based on the play of the same name by Uladzimir Karatkievič. Karatkievič's idealization of the main hero exactly suited the metaphoric and symbolic style of the director. Staged in 1978 – fifteen years after the play was written – Mazynski's production became a model representation of the image of Kalinoŭski in the second half of the 20th century.

Great possibilities for an excellent theatrical embodiment were given by the dramatic poem by Arkadź Kuliašoŭ, *Chamucius* (1975), in which he painted a deep psychological portrait of the hero. It is symptomatic that contemporary Belarusian theatres do not feel the need for Aleś Pietraškievič's play *Rytsar svabody*, written in 2003.

[12] B. Siwek, *op. cit.,* s. 136–137. Przekład Siarhiej Kawalou.

[13] *Ibid.,* s. 139.